УДК 93/94:63(476)

# ДА ГІСТОРЫІ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАГА МАШЫНАБУДАВАННЯ Ў ХІХ СТАГОДДЗІ: БУЛЬБАКАМБАЙН РАТАЎТА

**Галубовіч В. У., Радзюк А. Р.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Культура бульбаводства на тэрыторыі Беларусі і Літвы налічвае некалькі стагоддзяў і з'яўляецца неад'емнай часткай гісторыі сельскай гаспадаркі і айчыннай аграрнай навукі. Так, па некаторых звестках, бульбаводства на Гарадзеншчыне пачало пашырацца ўжо ў першай палове XVIII ст. [1]. У першай палове XIX ст. бульба прыжылася не толькі на панскіх агародах, але стала асноўнай палявой культурай для беларускіх сялян [2]. Пашырэнню бульбаводства спадарожнічала развіццё тэхналогіі вытворчасці і яе тэхнічнага забеспячэння. Ужо на пачатку XIX ст. сталі з'яўляцца ўборачныя сельскагаспадарчыя машыны, якія пачаткова завозіліся з-за мяжы і эксплуатаваліся ў гаспадарках заможных абшарнікаў [3]. Выявіліся і таленавітыя мясцовыя вынаходнікі сельгастэхнікі, у тым ліку з беларускіх сялян [3]. Не грэбавалі такімі эксперыментамі і прадстаўнікі вышэйшага саслоўя. Прыкладам можа быць гісторыя з праектам землеўладальніка Троцкага павета Ратаўта, які ў 1831 г. стварыў адзін з першых праектаў бульбакамбайна.



Малюнак 1 – Выява збоку: бульбакамбайн Ратаўта

Пра гэту спробу тэхнічнай навацыі вядома няшмат. Галоўнай крыніцай інфармацыі з'яўляецца адказ экспертаў, якія далі адзнаку машыны Ратаўта [4]. Аўтар праекта на пачатку 1832 г. са сваёй



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

прапановай звярнуўся да Віленскага грамадзянскага губернатара, які, у сваю чаргу, пераадрасаваў справу ў Віленскі ўніверсітэт, які ў гэты час знаходзіўся ў стадыі ліквідацыі. Супрацоўнікі гэтай навучальнай установы 14 лютага 1832 г. падрыхтавалі адказ. У склад універсітэцкай экспертнай камісіі ўваходзілі аўтарытэтныя спецыялісты: прафесар сельскай гаспадаркі Міхайла Ачапоўскі і выкладчык механікі Валерыян Гурскі. Адказ выкладчыкаў універсітэта быў дастаткова агульным і разлічаным на адрасата. М. Ачапоўскі і В. Гурскі паведамілі, што не толькі пазнаёміліся з праектам, але таксама асабіста сустракаліся з вынаходнікам *«для патрэбных тлумачэнняў»* і адказаў на *«некаторыя пярэчанні»*. Крытычныя заўвагі *«Аграномаў і Механікаў»*, як сябе назвалі эксперты, Ратаўт успрыняў адэкватна, а парады *«пажадаў выкарыстаць»*. Выяўленыя недахопы, галоўным чынам, датычыліся *«прыстасавання сашніка»* [4].

У сваім адказе М. Ачапоўскі і В. Гурскі адзначылі, што толькі па адным чарцяжы складана даць ацэнку якасці вынаходніцтва Ратаўта, паколькі *«гэта толькі меркаванне альбо праект машыны, без падлікаў сілы, неабходнай для яе руху і выдаткаў на выраб»*, акрамя таго, *«кожная машына павінна быць не толькі выраблена, але яшчэ і дзейнічаць»*. Сыходзячы з гэтага, эксперты прапанавалі вынаходніку *«заняцца ўвасабленнем свайго праекта і паказаць карыснасць машыны на вопыце»*. Пры гэтым было слушна заўважана, што кожны *«гаспадарчы механізм»* павінен адрозніваецца простай канструкцыяй, умераным коштам, трываласцю і непатрабавальнасцю да выкарыстання ім *«вялікай сілы»* [4].

Асобна М. Ачапоўскі і В. Гурскі выказалі захапленне дасведчанасцю Ратаўта ў галіне *«пачатковай механікі і земляробства»* ды асабліва падкрэслілі яго *«руплівасць у выкарыстанні сваіх ведаў для карысці грамадства»* [4]. Такім чынам, універсітэцкія выкладчыкі палічылі магчымай пры выпраўленні недахопаў далейшую працу над перспектыўным праектам.

Асобнай загадкай застаецца асоба вынаходлівага абшарніка. Род Ратаўтаў герба Бонча вядомы па гербоўніках з канца XVII ст., калі адзін з яго прадстаўнікоў разам з Навагрудскай шляхтай удзельнічаў у элекцыі манарха Рэчы Паспалітай. У першай палове XIX ст. некалькі галін роду жылі ў Віленскай і Ковенскай губернях, але, хто з шматлікіх Ратаўтаў быў інжынерам-канструктарам сельскагаспадарчай тэхнікі, невядома [5].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ



Малюнак 2 – Выява зверху: бульбакамбайн Ратаўта

Праект бульбакамбайна Ратаўта быў водгукам на запатрабаванні свайго часу, калі на тэрыторыі Беларусі і Літвы сапраўды пачынаецца масавая вытворчасць бульбы. Аўтар праекта абяцаў, са слоў экспертаў, пабудаваць сваю машыну, але, ці было гэта зроблена, ці не, сказаць цяжка, паколькі зрабіць вынаходніцтва і запусціць яго ў масавы продаж здольны далека не кожны. Адно можна сказаць дакладна, хаця гэта вынаходніцтва і не стала шырока вядомым, а бульбакамбайн Ратаўта вядомы толькі па архіўнай справе, тым не менш, троцкі абшарнік у агульных рысах прадбачыў форму машыны, якая пазней лічылася найлепшай (бульбакапальнік Кабылінскага) [6].

**ЛІТАРАТУРА**


1. Бульба белорусская: энциклопедия. – Минск: Беларус. Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – 384 с.
2. Гісторыя сялянства Беларусі: У 3 т. Т. 1. Гісторыя сялянства Белларусі ад старажытнасці да 1861 г. – Мн.: Беларуская навука, 1997. – 431 с.
3. История аграрной науки Беларуси (XIX - начало XX в.). В 2 ч. Ч. 1. – Минск: Беларуская навука, 2017. – 310 с.
4. Lietuvos vastybės istorijos archyvas. F. 380. AP. 74. S.VT. 1625.
5. Rodzina – herbarz szlachty polskiej / Opracowany przez Alersandra Włodarskiego. T. XV. – Warszawa: Skład główny księgarnia Gebethnera i Wolffa, 1931. – 384 s.
6. Картофеле-копатели // Энциклопедический словарь. T. XIV. Карданахи-Керо. Издатели: Ф. А. Брокгауз, И. А. Эфрон. – СПб.: Типо-Литография И. А. Эфрона, 1895. – С. 623-624 (гл. ілюстрацыю да артыкула).


РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ